■ Жывая зямля

Падзея ў прыродзе Беларусі, схаваная ад вачэй гарадскіх жыхароў, — адлёт жураўлёў. Сёлета ён супаў з заканчэннем бабінага лета — сярэдзінай кастрычніка. Калі птушкі пакідаюць Ельню — свой заўсёдны прыстанак на нашай зямлі, іх журботныя галасы даносяцца з усіх куточкаў вялікага балота, з навакольных палеткаў, з зацягнутага цяжкімі хмарамі паднябесся.

ПАД ЖУРАЎЛІНЫМІ КРЫЛАМІ

На поўдзень кліча дарога птушак, у далёкі вырай, куды не сягаюць зімовыя сцюжы. Амаль два тыдні сумнакрылыя птахі гасцявалі на беларускай зямлі, падмацоўваліся, адпачывалі, набіраліся сілы. Удзень кармліліся на прыбраных кукурузных палетках, утвараючы сапраўдныя калоніі. Увечары, калі да скону дня заставалася не больш за паўгадзіны, асобнымі чародамі адляталі на больш бяспечныя яльнянскія выспы. І вось, развітваючыся, жураўлі робяць у небе кола за колам і ўзносяцца ўсё вышэй і вышэй, нібы спрабуюць свае адпачыўшыя крылы ў порсткіх ветравых патоках. Пранізлівае курлыканне паволі слабее і ўжо ледзь чутно з вышыні, пакуль, нарэшце, зусім не знікае. Нізкія аблокі хаваюць ад вачэй апошні жураўліны клін...

Сёлета ў ваколіцах заказніка «Балота «Ельня» прайшоў штогадовы падлік гэтых птушак. Назіранне праводзілася напрыканцы верасня з розных кропак вакол балота. Было выяўлена, што Ельня стала месцам адпачынку амаль для 7 тысяч жураўлёў — гэта найбольшая іх колькасць за ўвесь час назіранняў. Вядома, што гэтыя жураўлікі — пераважна мігранты з поўначы Расіі. І зусім невялікая частка — прадстаўнікі мясцовай папуляцыі, якая гнездавалася на тэрыторыі і славутага заказніка, і іншых балот Віцебшчыны.

Каб паназіраць за жураўлямі ў месцах, дзе іх найбольшая колькасць увосень, прыйшлося загадзя будаваць спецыяльныя буданы-схованкі. Сёлета некалькі соцень птушак доўга трымаліся на палетках у паўночна-заходнім баку ад Ельні — на памежжы Мёрскага і Шаркаўшчынскага раёнаў. На ўскрайку аднаго з палёў з убранай кукурузай, узвёўшы з вецця і сухой травы невялікае ўкрыццё, давялося некалькі дзён запар па шэсць-восем гадзін правесці ў нерухомым чаканні, каб рабіць фотаздымкі з блізкай адлегласці: настолькі гэтая птушка асцярожная і палахлівая. Цярпенне не было дарэмным: у адзін з дзён побач з вёскай Більдзюгі жураўліная чарада наблізілася да маёй схованкі амаль на паўсотню метраў. Было добра відаць, як паміж птушкамі ўзнікалі спрэчкі і справа даходзіла да боек крыламі і дзюбамі. Не раз яны пачыналі танцаваць адзін перад адным, высока падскокваючы. Напэўна гэтак сярод мацнейшых вызначаюцца важакі, якім давядзецца выконваць ролю капітанаў на доўгім шляху ў вырай.

У наступны дзень чаканне журавоў каля вёскі Новы Пагост было марным: птушкі не нагадалі пра сябе нават сумнай песняй. Значыць, жураўлі, усе да апошняга, адляцелі ў вырай. Яны нібы адчувалі набліжэнне халадоў: праз некалькі дзён на Віцебшчыне сапраўды выпаў першы снег.

Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.

■ Працяг тэмы

ПАРАВОЗЫ ЯШЧЭ ПАПРАЦУЮЦЬ?

Ідэя рэтрацягніка пакуль «саспявае»

Паслугамі Гродзенскага чыгуначнага вакзала аўтару гэтых радкоў даводзілася карыстацца неаднойчы. Але так, як 27 снежня мінулага года, — упершыню. Цягнік «узначальваў» паравоз, а машыніст, яго памочнік і кандуктар былі ў форменным адзенні XIX стагоддзя. Білет у вагон першага класа, са штампам Санкт-Пецярбургска-Варшаўскай чыгункі каштаваў з Гродна да станцыі Парэчча 70 капеек серабром. Кандуктар, як і мае быць, цікавілася наяўнасцю праязных дакументаў і жадала пасажырам (гэта былі ветэраны, сённяшнія работнікі Беларускай чыгункі і журналісты) шчаслівай дарогі. Аркестр, гудкі паравоза...

А ўсё таму, што ў гэты дзень наша чыгунка адзначала сваё 150-годдзе. Да юбілею аднавілі два паравозы, пашылі «гістарычныя» касцюмы. Невыпадковы быў і святочны маршрут, па якім накіраваўся рэтрацягнік: 32-кіламетровы ўчастак з Гродна да Парэчча — гэта першынец чыгуначнай магістралі на беларускіх землях.

Па шляху ў Парэчча цягнік вітаў гудкамі прыпыначная пункты, экскурсавод узгадвала старонкі з гісторыі айчыннай чыгункі і яе першага ўчастка. А галоўныя падзеі свята разгарнуліся на канцавой станцыі, на пероне каля будынка аднаго са старэйшых у Беларусі вакзалаў. Неўзабаве туды прыбыў яшчэ адзін «гістарычны» цягнік, і са стылізаванага пад даўніну вагона выйшлі генерал-маёр Герстфельд, які кіраваў работамі на будаўніцтве гэтай магістралі, і іншыя афіцыйныя асобы з Санкт-Пецярбурга. Тэатралізаваная імпрэза з нагоды юбілею адкрыцця першага ўчастка Беларускай чыгункі ўдалася на славу. Пра яе расказалі многія СМІ, у тым ліку і «Звязда». Пры гэтым шмат гаварылася пра далейшае выкарыстанне рэтрацягніка ў турыстычных мэтах.

Аднак свята завяршылася, паравозы далі развітальныя гудкі і рушылі назад у Баранавічы, дзе знаходзяцца і цяпер. Няўжо цікавая задумка абмяжуецца толькі макетам паравоза, устаноўленым каля вакзала ў Парэччы, а сапраўдныя паравозы будуць чакаць наступнага юбілею?

Дацэнт Гродзенскага дзяржаўнага аграрнага ўніверсітэта, кандыдат тэхнічных навук Сяргей ЛАДУЦЬКА, у прыватнасці, прапанаваў:

— Можна даставіць адзін з паравозаў (з рэтравагонам) на станцыю «Раённая», што побач з вуліцай Белыя Росы ў Гродне. Ездзіць далёка на старых паравозах будзе вельмі дорага (хіба што па замове кампаніі багатых турыстаў), а вось пакатацца ў межах названай станцыі — гэта рэальна. Няхай дзеці і ўсе ахвотныя паглядзяць, што такое паравоз.

Сяргей Мікалаевіч з задавальненнем пазнаёміў бы з паравозам і сваіх студэнтаў, бо моладзь ужо не ведае пра рухавікі такога тыпу.

Прапановы нашага чытача былі разгледжаны Беларускай чыгункай, пра што рэдакцыі паведаміў **першы намеснік начальніка Віктар МІХАЙЛЮК**:

— Работы, звязаныя з развіццём турыстычнай дзейнасці, забяспечваюць турцэнтры «Дартур» Мінскага і Брэсцкага аддзялення Беларускай чыгункі. Прыярытэтам у працы гэтых падраздзяленняў з'яўляецца арганізацыя ўязнога і ўнутранага турызму з максімальным выкарыстаннем чыгуначнага транспарту... Сёння Беларуская чыгунка мае магчымасць арганізацыі турыстычных маршрутаў з «удзелам» рэтрацягнікоў. Для гэтых мэт могуць быць задзейнічаны два паравозы, якія выкарыстоўваліся ў мерапрыемствах з нагоды святкавання 150-годдзя Беларускай чыгункі на ўчастку Гродна-Парэчча. У выпадку наяўнасці попыту на арганізацыю чыгуначных турыстычных маршрутаў, у тым ліку з выкарыстаннем паравознай цягі, Беларуская чыгунка гатова разгледзець магчымасць і ажыццявіць гэтыя перавозкі.

Такім чынам, паравозы ёсць, магчымасці для іх выкарыстання ў турыстычных мэтах і адпаведныя структуры — таксама. І «ў выпадку наяўнасці попыту»... А вось тут варта задумацца. Ад каго ж павінна зыходзіць ініцыятыва? Няўжо не ад арганізатара паслугі? Менавіта яго задача — распрацаваць і прапанаваць кліенту варыянты і ўмовы рэалізацыі гэтага праекта, зацікавіць канкрэтным турыстычным прадуктам. Інакш аб якім попыце на маршруты з выкарыстаннем тых жа паравозаў можна казаць? Гэта як у краме: новы тавар спачатку прапануюць праводзіць актыўную рэкламную кампанію, а ўжо потым рэагуюць на запыты, пажаданні пакупнікоў, уносяць тыя ці іншыя карэктывы.

Замежнага вопыту ў «рэтрачыгуначнай» сферы хапае. У Славакіі, напрыклад, 30 гадоў таму закрылі Чарнагорскую вузкакалейку. Рэйкі і рухомы састаў павінны былі дэмантаваць. Аднак грамадскія актывісты прапанавалі іншы варыянт, які стаў даволі паспяховым бізнес-праектам. Паравозы і гістарычныя вагоны з мая па кастрычнік абслугоўваюць сотні турыстаў: можна заказаць экскурсіі, групавыя паездкі, спецыяльныя дзіцячыя туры.

Добрыя прыклады ў гэтым кірунку ёсць і ў Польшчы. Літаральна па-суседску з Гродзеншчынай, на Сувальшчыне, да пачатку 1990-х аказалася амаль закінутай, але потым вярнулася да жыцця Вігерская вузкакалейная чыгунка. Калісьці па ёй перавозілі драўніну, а цяпер, калі вырубка лесу ў гэтай зоне забаронена, возяць турыстаў, каля 20 тысяч штогод. Па маршруце руху, які праходзіць праз лясы Аўгустоўскай пушчы і Вігерскага нацыянальнага парку, абсталяваны аглядныя пляцоўкі. У ліпені і жніўні вузкакалейка працуе штодзённа, а ў астатнія месяцы — па групавых заказах. У штаце — некалькі пастаянных работнікаў і з дзясятак сезонных (у асноўным студэнтаў), занятых улетку на пуцявых работах.

Але вернемся да прапановы Сяргея Ладуцькі па размяшчэнні аднаго з паравозаў у Гродне. На жаль, у вышэйзгаданым афіцыйным адказе з Беларускай чыгункі пра гэта ні слова. Дык што, адсвяткавалі з паравозам і хопіць з яго?

Цяпер у Гродне безумоўны прыярытэт — развіццё чыгуначнага вузла, сур'ёзная рэканструкцыя вакзала. Але і ад ідэі рэтрацягніка ў турыстычных мэтах не адмовіліся, паведаміў **намеснік начальніка аб'яднанай станцыі Гродна Канстанцін САКОВІЧ**. Ён удзячны Сяргею Мікалаевічу за ягоную прапанову і лічыць яе ажыццяўленне цалкам рэальным — можа, не на станцыі «Раённая», а ў іншым месцы з больш маляўнічымі краявідамі. Ужо разглядаліся і варыянты выкарыстання рэтрацягніка як сегмента нейкага турыстычнага маршруту. Напрыклад, група турыстаў наведвае гістарычныя славутасці Прынямоння, і як эксклюзіў ім прапануюць паездку ў цягніку з паравозам па першым участку Беларускай чыгункі. Планавалася нават такая паслуга, каб турыст пры жаданні мог пераапрануцца і пакідаць у топку вугалёк.

А спачатку, кажа Канстанцін Саковіч, трэба стварыць інфраструктуру для абслугоўвання рэтрацягніка, запасы вугалю, падабраць штат людзей, падрыхтаваных кіраваць гэтым відам рухомага саставу. І, вядома, распрацаваць канцэпцыю турыстычнага прадукту, пралічыўшы яго эканоміку.

Ідэя выкарыстання рэтрацягніка не толькі па значных юбілейных датах яшчэ «саспявае»...

Барыс ПРАКОПЧЫК

■ На кантролі

СКАРДЗЯЦЦА? ПРАВЯРАЙЦЕ І АДКАЗВАЙЦЕ!

Сёлета ў Віцебскай вобласці за парушэнні пры разглядзе зваротаў, унесеных у кнігу заўваг і прапаноў, да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнулі дзевяць адказных асоб, да дысцыплінарнай — шэсць. Агульная сума штрафаў склала 3,1 мільёна рублёў.

— Запіс у кнігу прыраўноўваецца да пісьмовага звароту. І парадак яго разгляду рэгламентаваны законам аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб. А парадак вядзення кнігі заўваг і прапаноў зацверджаны пастановай урада. Усе дзеянні службовых асоб пры рабоце з такімі зваротамі выразна рэгламентаваны. Парушэнне ўстаноўленага тэрміну разгляду заўваг і прапаноў альбо не інфармаванне грамадзяніна ва ўстаноўлены тэрмін аб адмове ў задавальненні заўвагі ці прапановы цягнуць за сабой папярэджанне або накладанне штрафу — ад чатырох да дзесяці базавых велічынь, — нагадалі ў Камітэце дзяржкантролю Віцебскай вобласці.

Падчас кантрольных мерапрыемстваў выяўлена нямала парушэнняў.

Напрыклад, у Віцебскім гарвыканкаме не ўнеслі ў кнігу звесткі аб выніках разгляду скаргі. Калі заяўнік праз месяц пры паўторным наведванні не ўбачыў адпаведнага запісу, ён напісаў новую скаргу, але ўжо кантралёрам. Вінаватую службовую асобу прыцягнулі да адміністрацыйнай адказнасці.

А ў віцебскай ВНУ не разгледзелі адразу дзве скаргі, унесеныя ў кнігу наведвальнікам інтэрната. У кнізе быў зроблены запіс аб растлумачэнні яму правілаў знаходжання ў інтэрнаце. Аднак пісьмовы адказ па выніках разгляду скаргаў накіраваны не быў. Службовая асоба, адказная за вядзенне кнігі заўваг і прапаноў, заплаціла штраф.

— Падчас праверкі гэтага факта высветлілася, што ў ВНУ ўвогуле не быў вызначаны алгарытм дзеянняў пры паступленні скаргаў у кнігу заўваг і прапаноў. Напрыклад, як дзейнічаць загадчыцы інтэрната пры паступленні скаргі, калі саму кнігу нельга забіраць з месца захоўвання, але пры гэтым неабходна паказаць скаргу кіраўніку для прыняцця рашэння па яе разглядзе, — растлумачылі нюансы ў кантрольным ведамстве.

У выніку маніторынгу ў іншых інтэрнатах той жа ВНУ таксама выявілі шэраг парушэнняў у арганізацыі працы з кнігамі заўваг і прапаноў. Для двух інтэрнатаў універсітэта была заведзена адна кніга, у той час як заканадаўствам прадугледжана вядзенне кнігі ў кожным адасобленым падраздзяленні арганізацыі, размешчаным па-за месцам яе знаходжання... Па выніках маніторынгу кіраўніку ўстановы адукацыі накіравалі рэкамендацыі па ліквідацыі выяўленых парушэнняў і недахопаў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

У ВІЦЕБСКУ АКТЫЎНА «ЎЗЯЛІСЯ» ЗА ДВАРЫ

У Віцебску рэалізоўваецца маштабная і ўнікальная праграма «Двары». Ініцыятарам навядзення парадку ў дварах стаў Аляксандр Косінец, старшыня Віцебскага аблвыканкама.

Ён патрабуе, каб у сталіцы міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» было прыгожа паўсюды. Губернатар даручыў кіраўніцтву гарвыканкама, не спасылаючыся на фінансавыя цяжкасці, шчыльна ўзяцца за добраўпарадкаванне дваравых тэрыторый.

Ужо заменены асфальт у больш як 130 дварах. Агульная плошча адрамантаваных дваравых тэрыторый — каля 38 тысяч квадратных метраў. На рамонт патрацілі больш як 2,8 мільярда рублёў.

Але, лічаць гараджане, радавацца яшчэ рана. У абласным цэнтры прыблізна 1,6 тысячы двароў, то яшчэ трэба значна папрацаваць.

Адказныя асобы канстатуюць, што двары прыводзяцца ў парадак не толькі ў цэнтральнай частцы горада.

— Праца па добраўпарадкаванні дваровых тэрыторый ідзе не на словах, а на справе. Аднак дзейнасць у гэтым кірунку патрабуе пастаяннага кантролю. Трэба скончыць пачатае і працягнуць запланаванае — добраўпарадкаваць ускраіны горада. Гэтая праца пачалася, — пракаментаваў выкананне праграмы «Двары» **Мікалай СМУНЁЎ, старшыня Віцебскага гарсавета дэпутатаў**.

У гарсавеце лічаць, што пры асфальтаванні вулачак і двароў можна было б значна эканоміць, калі б у камунальнікаў, якія адказваюць за двары, з'явіўся невялікі завод па вырабе асфальту. Гэта дазволіла б абыходзіцца без паслуг падрадных арганізацый, якія выконваюць заказы па асфальтаванні.

Аляксандр ПУКШАНСКІ

■ Ёсць пытанне!

ЧЫМ ПАХНЕ «САРЫЯ», або Пасляслоўе да аднаго звароту

У рэдакцыю газеты паступіў электронны зварот ад імя жыхароў вёсак Сігневічы, Марэвіль, Падвоссе Бярозаўскага раёна. Аўтар звароту Генадзь Васілюк паведаміў пра суседства з прадпрыемствам «Сарыя Бія-Індастрыс», ад якога церпяць усе вяскоўцы. *«Увесь гэты час мы вымушаны дыхаць едкімі газамі, якія ідуць з боку прадпрыемства. Ужо другі год на палі бліжэйшага калгаса вывозяць брудную жыжу... Раней у недалёкай сажалцы нават жыла рыба, цяпер тут смярдзючае балота...»* Праз некаторы час рэдакцыя і заяўнік атрымалі адказы прыродаахоўных ведамстваў, Бярозаўскага райвыканкама. Але спадар Васілюк застаўся незадаволены адказамі, напісаў, што яны падобныя на адпіскі, бо тую жыжку як вазілі на палеткі, так і возяць. *«І як можна вазіць такія стокі на палі, калі ў краіне афрыканская чума?»* — заключае свой ліст аўтар.

Пачну з таго, што замежнае прыватнае вытворчае гандлёвае ўнітарнае прадпрыемства «Сарыя Бія-Індастрыс» знаходзіцца недалёка ад вёскі Падвоссе за 17 кіламетраў ад горада Бяроза. Яно займаецца зборам і перапрацоўкай адходаў жывёльнага паходжання, з якіх вырабляюцца харчовыя дабаўкі для жывёлы — такія, як мяса-косная мука, тлушч і іншыя. На прадпрыемстве ёсць лакальныя ачышчальныя збудаванні для ачысткі прамысловых і гаспадарча-бытавых сцёкавых вод. Сабраны ў выніку ачысткі актыўны глей падаецца па напорным трубаправодзе на спецыяльныя пляцоўкі. Ачышчаныя сцёкі паступаюць для даачысткі на біялагічныя сажалкі... Абёмы вытворчасці ў прадпрыемства вялікія, а значыць, і адходаў утвараецца шмат. Зразумела, паўстала пытанне аб іх утылізацыі. Таму, цытую адзін з афіцыйных адказаў: *«У адпаведнасці з пісьмом Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя РБ ад 14.10 2010 года, разгледжана магчымасць скідвання вытворчых сцёкавых вод прадпрыемства «Сарыя Бія-Індастрыс» на перыяд рэканструкцыі ачышчальных збудаванняў у жыжказборнікі СВК «Вінец».*

Фактычна ж гэты глей не накіроўваецца ў жыжказборнікі сельгаспрадпрыемства, а вывозіцца на палі ў якасці арганічнага ўгнаення.

Кіраўнік СВК «Вінец» Яўген Шымчук сказаў карэспандэнту «Звязды», што яны за бяспеку арганікі не апасаюцца, бо пярвічныя аналізы, праведзеныя адпаведнымі службамі, ніякіх перавышэнняў дапушчальнай канцэнтрацыі шкодных рэчываў не выявілі. Больш за тое, «Сарыя» рыхтуе да заключэння дагавор з Палескім аграрна-экалагічным інстытутам Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі — па распрацоўцы тэхнічных умоў прымянення актыўнага глею ў якасці дабаўкі для глебы. Навукоўцы з вышэйзгаданага інстытута ўжо не раз бывалі на палях СВК «Вінец», для любога абгрунтаванага заключэння трэба некалькі гадоў доследаў, эксперыментаў, аналізаў. Так што афіцыйны дакумент можа з'явіцца на свет не раней чым праз некалькі гадоў. А пакуль...

Нельга не пагадзіцца з Яўгенам Пятровічам Шымчуком у тым, што такое прадпрыемства нашай краіне было неабходна. «Сарыя» перапрацоўвае тое, што ў многіх месцах гніло на звалках, а часам вывозілася ў навакольныя лясы, гніло ў кар'ерах за жывёлагадоўчымі комплексамі. Ніводзін жывёлавод не застрахаваны ад падзяжу жывёлы, якую трэба ўтылізаваць цывілізавана. Машыны прадпрыемства забіраюць нежывую жывёлу з некалькіх абласцей рэспублікі і прывозяць на перапрацоўку ў Бярозаўскі раён.

А вось за правільную ўтылізацыю ўжо сваіх уласных адходаў адказвае само прадпрыемства. Другая праблема — паветра: глей з вільготнасцю больш за 70% мае спецыфічны пах, мякка кажучы, не вельмі прыемны. Таму і пішуць людзі ў розныя інстанцыі. Нельга сказаць, што нічога не робіцца на прадпрыемстве для памяншэння наступстваў выкідаў у атмасферу. У канцы мінулага года быў устаноўлены іонаабменны фільтр для выдалення непрыемных пахаў, якія ўтвараюцца падчас тэхналагічнага працэсу, што паменшыла выкід смуроду ў атмасфернае паветра.

Пра гэта гаворыцца ў афіцыйным адказе Брэсцкага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Там жа пазначана, што Брэсцкай абласной лабараторыяй Рэспубліканскага цэнтра аналітычнага кантролю ў галіне аховы навакольнага асяроддзя сістэматычна вядзецца кантроль выкідаў у атмасферу ад стацыянарных крыніц прадпрыемства. Перавышэнняў нарматываў не ўстаноўлена.

Дарэчы, у дзень наведвання аўтарам гэтых радкоў вёсак Падвоссе, Сігневічы, Вінін *(21 кастрычніка.* — **Аўт.**) у населеных пунктах ніякага спецыфічнага паху не адчувалася. Гэта не азначае, што яго не бывае наогул: усё залежыць ад напрамку ветру. Зменіцца вецер — і прынясе смурод з біясажалак «Сарыі». Што тут скажаш: людзям, што жывуць па-суседстве з такім прадпрыемствам, не пашанцавала...

Няма сумнення ў тым, што ў кожным з адказаў, якія атрымалі аўтар звароту і газета, змяшчаецца праўдзівая інфармацыя, але ж меры, якія прымала прадпрыемства і кантралюючыя органы, яўна недастатковыя. Перачытваючы адказы, прыходзіш да высновы, што знайсці тлумачэнне можна ўсяму. Тым больш, калі гутарка ідзе аб прадпрыемстве, якое патрэбна краіне і з'яўляецца бездакорным падаткаплацельшчыкам у раённы бюджэт. Напэўна, нездарма еўрапейскі бізнесмен адкрыў тут сваю вытворчасць. Таму што ў сябе на радзіме заняцца падобным было б складана і вельмі дорага. Там, калі нешта не так, прыродаахоўныя органы заваляць штрафамі і санкцыямі. У нас жа і заканадаўчая база, і грамадская экалагічная свядомасць крыху на іншым узроўні. Значыць, сам бізнес павінен гэта ўлічваць і рабіць усё магчымае для мінімізацыі негатыўных наступстваў сваёй вытворчасці.

Напэўна, нездарма еўрапейскі бізнесмен адкрыў тут сваю вытворчасць. Таму што ў сябе на радзіме заняцца падобным было б складана і вельмі дорага.

На «Сарыі» гэта не адмаўляюць. Вось што сказаў карэспандэнту газеты галоўны інжынер прадпрыемства «Сарыя Бія-Індастрыс» Ігар Крэйдзіч:

— Зараз мы ажыццяўляем праект па рэканструкцыі прадпрыемства — і ў прыватнасці,і рэканструкцыі лакальных ачышчальных збудаванняў. Завяршэнне работы выведзе на новы якасны ўзровень ачыстку стокаў. Дарэчы, згодна з першапачатковым планам, новыя ачышчальныя павінны былі ўжо дзейнічаць, але нас падвялі пастаўшчыкі абсталявання і работа зацягнулася. Абсталяванне ўжо атрымана, вядзецца яго наладка. Працэс гэты надзвычай складаны і адказны, фарсіраваць яго мы не можам, бо ўсё павінна працаваць бездакорна. Таму, калі не ўдасца скончыць мантаж і наладку сёлета, будзем даводзіць яе да толку ў наступным годзе, каб ачышчальныя збудаванні функцыянавалі без збояў. Калі ўсе ўказаныя прыстасаванні для ачысткі паветра і сцёкаў будуць гатовы, негатыўны ўплыў на навакольнае асяроддзе звядзецца да мінімуму.

Заявы наконт пагрозы распаўсюджвання афрыканскай чумы Ігар Крэйдзіч лічыць неабгрунтаванымі.

І ўсё ж гарантаваць, што жыхары навакольных вёсак у любое надвор'е не будуць адчуваць дрэнны пах з боку прадпрыемства, ніхто не можа. Людзі аказаліся міжвольнымі заложнікамі спецыфічнай вытворчасці. Відаць, у свой час мясцовай уладзе трэба было праявіць большую ўвагу і лепш выбіраць пляцоўку. Але цяпер ужо і пляцоўку не памяняеш, і вытворчасць не перанясеш. Можна хіба што пасадзіць больш дрэў, загарадзіць населеныя пункты зялёнымі паглынальнікамі паху, а таксама, не лічачыся з затратамі, набываць самыя сучасныя фільтры. І тут прынцыповасць і настойлівасць павінна праяўляць мясцовая ўлада.

Але ж, калі меркаваць па адказе, атрыманым з райвыканкама, — там знаходзяцца ў палоне пэўных ілюзій, бо пішуць пра магчымае ўжо сёлета(!) добраўпарадкаванне і зарыбленне біясажалак і вадаёма каля іх. Цікава, якая рыба там можа жыць, калі нават дрэвы вакол вадаёма засохлі? Але ж марыць пра тое, што напісана, і набліжаць гэтую мару канкрэтнымі адміністрацыйнымі дзеяннямі, вядома, не забараняецца.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Бярозаўскі раён